

Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

Жнівень 2012 г.

ЗАБЯСПЕЧЫМ АЛЯКСАНДРУ ВІКТАРАВІЧУ ГОДНУЮ СТАРАСЦЬ!



Як і пісала амаль два месяцы таму сяброўская незалежная газета "Паходня", кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па Шклоўскай выбарчай акрузе № 90 ад уладных структур будзе пенсіянер па ўзросту Аляксандр Агееў. Дзіўна, але шматгадовай напружанай працы на шматлікіх кіруючых пасадах не хапіла Аляксандру Віктаравічу дзеля забеспячэння камфортнага існавання на пенсіі. Інакш навошта Агееву, які пакуль яшчэ працуе намеснікам старшыні КДК, падавацца ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў…

А тое, што менавіта пенсіянер Аляксандр Віктаравіч Агееў будзе дэпутатам "Палаты" па нашай акрузе, у мяне асабіста не выклікае ніякага сумневу. Рашэнне прынятае на самым высокім узроўні, ну а тое, як прагаласуюць выбаршчыкі, у нашай краіне не мае абсалютна ніякага значэння. Выбары даўно ўжо ператварыліся ў своеасаблівы рытуал, дзе выбаршчыкі галасуюць, а ўлады абвяшчаюць вынік, які ім патрэбны. Зараз вось з сумамназіраю на замучаных жанчын,- якія, па загаду кіраўніцтва, збіраюць подпісы за вылучэнне Агеева кандыдатам у дэпутаты. Навошта гэта патрэбна, абсалютна не разумеюць ні яны, ні я. Прызначылі б ужо дэпутата і не мучылі людзей. Таму асабіста я ўжо даўно выступаю за тое, каб увесь наш Нацыянальны Сход распусціць, а на замену яму прызначыць аднаго Колю. Усё роўна беларускі "парламент" абсалютна нічога не вырашае, а Коля няхай трэніруецца, ён жа спадчыннік, ды і генералам будзе неяк лепш ужо больш афіцыйна яму казыраць. А то ўсе ж неяк няёмка перад мальцом выслужывацца, спіну гнуць. А грошы колькі з'эканомім на ўтрыманні

(Працяг на стар. 2)

БЫЛЫ ПЕРШЫ САКРАТАР БЯЛЫНІЦКАГА РАЙКАМА КПБ СКАРДЗІЦЦА НА МАЛУЮ ПЕНСІЮ І ЗАЙЗДРОСЦІЦЬ МІЛІЦЫЯНЕРАМ

Анатоль Глаз лічыць, што чыноўнікам трэба плаціць пенсію папоўнай, як міліцыянерам, перадае "Еўрарадыё". Ну а зараз больш за палову дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў ідуць... на пенсію?

Толькі памер сваёй пенсіі дэпутаты не ведаюць, а былыя — не кажуць.

Еўрарадыё падлічыла: у пакуль яшчэ дзеючым складзе Палаты прадстаўнікоў 58 пенсіянераў ці тых, хто стане імі праз некалькі месяцаў. Гэта больш за палову! 9 дэпутатам да заслужанага адпачынку застаўся 1 год, яшчэ 43 — больш за год.

Як вядома, заробак парламентара прыраўноўваецца да заробку міністра. На сёння гэта каля 800 долараў. Дэпутату Уладзіміру Маёраву 60 гадоў спаўняецца праз некалькі месяцаў. На новы тэрмін ён не ідзе — можна спакойна ісці на заслужаны адпачынак. Але з якой пенсіяй?

Уладзімір Маёраў: "Шчыра — не ведаю! Калі б я сказаў, што не цікавіўся, то вы б мне не паверылі, сказалі, што я хлус: гэта любога чалавека нармальнага цікавіць. Цікаўлюся, безумоўна, і я. Але ў нас так званая пенсія залежыць ад заробку. І яна ў любы момант можа змяніцца, таму хлусіць вам не буду, кажу шчыра: я не ведаю".

(Заканчэнне на стар. 4)

ЗАБЯСПЕЧЫМ АЛЯКСАНДРУ ВІКТАРАВІЧУ ГОДНУЮ СТАРАСЦЬ!

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

"дэпутатаў", якія ўсё адно нічога не вырашаюць, адно толькі спаборнічаюць, хто больш падхалімаж перад усенародна абраным выкажа. Колі на цацкі ўсё ж менш патрэбна, ды і да пенсіі яму яшчэ далёка.

Дарэчы, не маюць ніякага сумневу ў тым, хто будзе дэпутатам Палаты прадстаўнікоў ад нашай акругі № 90, і сучасныя, і былыя чыноўнікі. Днямі размаўляў у Бялынічах з адным такім у мінулым даволі высокім начальнікам, а зараз пенсіянерам. Той усё здзіўляўся, навошта Агееву, якога ён добра ведае па сумеснай працы ў Бялыніцкім раёне, яшчэ і ісці працаваць дэпутатам у Палату прадстаўнікоў, "няўжо ж яму грошы не хапае, сядзеў бы на пенсіі". Калі ж я нешта пачаў казаць пра тое, што яшчэ ж будуць выбары, былы чыноўнік адказаў "не кажы ты хоць мне пра гэтыя "выбары", я сам табе пра іх магу столькі расказаць, але дзеці працуюць". Як кажуць, без каментароў…

Каб крыху распавесці пра нашага новага дэпутата, нагадаю тое, пра што я ўжо раней пісаў у сяброўскай газеце "Паходня". Старэйшае пакаленне добра памятае, што Аляксандр Віктаравіч раней не адзін год адпрацаваў у нашым рэгіёне, у тым ліку на працягу шэрагу гадоў ён быў старшынёй Бялыніцкага райвыканкама ў 90-х гадах мінулага стагоддзя. Са сваёй пасады Агееў быў звольнены за правалы ў працы пасля гучнага скандала і канфлікта з тагачасным старшынёй Магілёўскага аблвыканкама Міхаілам Дражынам. Усе падрабязнасці звальнення Аляксандра Віктаравіча неаднаразова паказала Магілёўскае тэлебачанне, гучная адстаўка шырока абмяркоўвалась у чынавецкіх кругах. Але без працы Аляксандр Агееў прабыў не доўга, ужо праз пару месяцаў, пасля звароту за дапамогай да Рыгоравіча, ён быў прызначаны галоўным інспектарам адміністрацыі прэзідэнта па Брэсцкай вобласці. Пасля Аляксандр Агееў пэўны час працаваў міністрам энергетыкі краіны, дамаўляўся ў Расіі наконт наннай нафты і газу.

У палітычнай лаяльнасці і асабістай адданасці Лукашэнка Агееў выдатна зарэкамендаваў сябе яшчэ ў дапрэзідэнцкія часы. Быўшы старшынёй Бялыніцкага райвыканкама, Агееў актыўна ўдзельнічаў у кампаніі дэпутата Лукашэнка, якая ўвайшла ў гісторыю як «барацьба з бялыніцкай і шклоўскай мафіяй». У Бялынічах галоўнай мэтай маладых антыкарупцыянераў стаў мясцовы міліцэйскі начальнік Ігар Шчарбакоў. Газеты тады пратрубілі на ўсю краіну пра шыкоўную дачу Шчарбакова з выдатным возерам і мармуровымі прыступкамі. Зрэшты, калі Шчарбакоў стаў судзіцца, аказалася, што дача самая звычайная, возера дэградавала да саджалкі, а мармуровыя прыступкі абярнуліся банальным ганкам. Пройдучы ўсе судовыя інстанцыі, Шчарбакоў выйграў суд пра аднаўленне на працы, але СМІ гэта ўжо не цікавіла — з антыкарупцыянера Лукашэнка ператварыўся ў прэзідэнта. *Агееву* ж заставалася чакаць сваёй гадзіны.

Запомніўся Аляксандр Віктаравіч бялынічанам і сваім канфліктам з тагачасным старшынёй калгаса імя Фрунзэ Міхаілам Аляксейчыкавым. У выніку перспектыўнага старшыню з калгаса выжылі, а пасля гэтага ў хуткім часе ляснуў і сам калгас імя Фрунзе, які да гэтага быў адной з лепшых гаспадарак Бялыніцкага раёна.

Неабходна адзначыць, што Аляксандр Агееў ужо быў дэпутатам верхняй палаты беларускага "парламента" (Савета Рэспублікі) у 90-я гады, калі быў разагнаны законна выбраны Вярхоўны Савет і з лаяльных чыноўнікаў быў сфармаваны двухпалатны "Нацыянальны Сход". За сваю дзейнасць ён быў нават узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага Сходу.

(Заканчэнне на стар. 3)



ЗАБЯСПЕЧЫМ АЛЯКСАНДРУ ВІКТАРАВІЧУ ГОДНУЮ СТАРАСЦЬ!

(Заканч. Пачатак на стар. 1-2)

Крыху сумна, што не хоча слухацца сяброўскіх парадаў і зноў увязваецца ў гульню з напарсткавікамі мой стары сябар Рыгор Кастусёў, які збіраецца вылучацца ў якасці кандыдата ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў па гэтай жа нашай акрузе ад партыі БНФ. Таму і звяртаюсь да яго пісьмова: Рыгор Андрэевіч, ездзі сабе і далей на заробкі ў Расію, навошта табе трэба ўдзельнічаць у гэтым спектаклі, няхай ужо Аляксандру Віктаравічу малююць патрэбны вынік і хай адпачне чалавек ля кармушкі на старасці гадоў. Мінулы наш дэпутат, Валерый Іваноў, бачыш, дагаджаў, каму трэба, дык узначаліў багацейшую Беларускую калійную кампанію, забяспечыў будучыню ўласных дзетак і унукаў. Зараз вось у Швейцарыю офіс яго кампаніі павінны перанесці, будзе сярод "праклятых буржуінаў" распавядаць аб квітнеючай Беларусі. Ты ж пачнеш сварыцца, за народ заступацца, патрабаваць нейкіх зменаў да лепшага, я ж цябе ведаю, дык яшчэ твой добры знаёмы Рыгоравіч цябе за краты ўпячэ, ён жа чалавек імпульсіўны, слова насуперак не пацерпіць. Калі што ў Расіі не заладзіцца, то на грыбах і ягадах выжывеш, каля Цяхціна іх шмат расце, навошта табе гэта дэпутатства, паспытаў ужо турэмнай баланды пасля прэзідэнцкіх выбараў…

Ну а Аляксандр Агееў сваёй вернай працай заслужыў сабе права, атрымліваючы добрую пенсію, спакойна спаць у "палатцы" і атрымліваць яшчэ і выдатны заробак, хвалячы нашага "нязменнага" і "квітнеючую Беларусь". Пенсіянерам паўсюль у нас дарога, ну а маладзейшыя няхай едуць на заробкі ў Расію альбо к "праклятым буржуінам" на Захад. Ведаеце, я ўжо пісаў, але напішу яшчэ раз, што мне зараз родная Беларусь усё больш пачынае нагадваць СССР позняга перыяду, калі краінай кіравалі старцы з палітбюро. Па ўсяму бачна, што да гэтага мы зноў і ідзём…

Іван Барысаў

ЛУКАШЕНКО: 500 ДОЛЛАРОВ СРЕДНЕЙ ЗАРПЛАТЫ – МИНИМУМ



Накануне парламентских выборы белорусские власти рапортуют об успехах в выполнении своего культового обещания довести среднюю зарплату в стране до 500 долларов.

Михаил Мясникович доложил Александру Лукашенко, что средняя зарплата повышается даже более высокими темпами, чем планировалось!

При этом премьер отметил, что, мол, этот соответствует росту производительности труда, как того требовал президент. В ближайшее время обещается поднять зарплаты бюджетникам и военным.

А Лукашенко обозначил новые высоты: «Средняя зарплата в 500 долларов – это самый минимум, который должен быть в нашей стране».

СПРАВКА "РЭГІЁНА"

Агеев Александр Викторович

Родился 31 января 1952 г. в д. Трилесино Горецкого района Могилевской области. В 1971 г. окончил Могилевский политехнический техникум. В 1971 г. работал техником-механиком Оршанского горпищеторга. В 1971—1973 гг. служба в Советской армии. В 1973 — ??? работал техником-механиком Оршанского горпищеторга. В 1979 г. окончил Белорусскую сельскохозяйственную академию по специальности инженер-механик. В 1979 — 1981 гг. старший инженер-контролер станции технического обслуживания, заместитель управляющего Белыничской райсельхозтехники Могилевского области. В 1981 — 1992 гг. инструктор орготдела Белыничского РК КПБ, председатель райсельхозхимии, заместитель председателя Белыничского агропромышленного объединения, заместитель начальника управления сельского хозяйства и продовольствия Белыничского райисполкома. С 1992 по 1999 г. председатель Белыничского райисполкома. В 1991— 1994 гг. депутат Белыничского районного Совета. В 1992 — 1994 гг. депутат Могилевского областного Совета. С 1996 г. член Совета республики Национального собрания Республики Беларусь, заместитель председателя Постоянной комиссии по региональной политике. 27 апреля 2000 г. указом Президента назначен помощником Президента — главным инспектором по Брестской области 6 августа 2004 г. указом президента № 384 назначен Министром энергетики Республики Беларусь (занял место Эдуарда Товпенца), освободив его от должности помощника Президента Республики Беларусь - главного инспектора по Брестской области. С мая 2006 г. назначен на должность заместителя Председателя Комитета государственного контроля Республики Беларусь. Увлечения: волейбол, борьба.

БЫЛЫ ПЕРШЫ САКРАТАР БЯЛЫНІЦКАГА РАЙКАМА КПБ СКАРДЗІЦЦА НА МАЛУЮ ПЕНСІЮ І ЗАЙЗДРОСЦІЦЬ МІЛІЦЫЯНЕРАМ

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

І дадае, што на пенсію не збіраецца — будзе працягваць працаваць. Як і яго калега Анатоль Глаз. Ён ужо амаль 8 месяцаў пенсіянер, але без міністэрскай пенсіі.

Анатоль Глаз: "Я пакуль атрымліваю пенсію 1 мільён і 200 тысяч рублёў. І гэта пенсія — па ўзросце. Яна мне выплачваецца, пакуль я працую. А калі не буду працаваць — тады пагляджу, якая будзе".

Ужо пенсіянерам прыйшла ў парламент Валянціна Лузіна. Пенсію ёй налічвалі па старым месцы працы — у райвыканкаме, дзе яна была намеснікам старшыні па сацыяльных пытаннях. Больш дэпутатам жанчына быць не хоча, як і ўладкоўвацца на працу. Але і дэпутацкай пенсіяй, гавораць, не цікавілася.

Валянціна Лузіна: "Што я буду атрымліваць, як я буду атрымліваць — пакуль не цікавілася".

Працаваць і пасля сыхода з парламента будуць пенсіянеры Ларыса Вершаловіч і Уладзімір Майсюк.

Дэпутат Анатоль Глаз лічыць, што чыноўнікам, якія працуюць, трэба плаціць пенсію па поўнай, як, напрыклад, плацяць міліцыянерам.

Анатоль Глаз: "Калі б я працаваў, да прыкладу, у органах міліцыі, служыў у арміі ці МНС, ці ў КДБ, то пасля выхаду на пенсію мне б плацілі поўную пенсію і тое, што я атрымаў бы за працу. А дзяржаўныя служачыя, калі яны працуюць, атрымліваюць толькі мінімум пенсіі па ўзросце. Астатняе ім не плацяць. А гэта, напэўна, не зусім правільна".

Каб даведацца, якую пенсію атрымліваюць народныя абраннікі, Еўрарадыё звярнулася да дэпутата мінулага склікання Ганны Буравай. Але яна толькі давяла, што ў яе мужа, які дэпутатам не быў, пенсія нават большая.

Дарэчы, з працаўладкаваннем у пенсіянераў з дэпутацкім мінулым праблемаў не будзе. Днямі кіраўнік краіны загадаў губернатарам паклапаціцца. І як прызнаўся Еўрарадыё дэпутат Уладзімір Маёраў, у яго ўжо была сустрэча са сваім губернатарам, цягам двух тыдняў прапануюць працу. Адное праблема: скрайні ўзрост чыноўніка — 65 гадоў. А то працаваць і працаваць...


Анатоль Глаз

Дзіўна гэта неяк, усё скардзяцца нашы чыноўнікі на цяжкую напружаную працу на карысць простых беларусаў, але на пенсію чамусьці іх ну ніяк не выгнаць...

Працуюць і працуюць, нягледзячы на "невыносныя цяжкасці", бедныя, аж пакуль на могілкі не патрапяць прама з працы...

КОШТЫ НАВУЧАНЬНЯ Ў ВНУ ВЫРАСЬЛІ Ў СЯРЭДНІМ НА 40%

ВНУ Беларусі пачалі абвяшчаць кошты навучаньня для студэнтаў-першакурсьнікаў.

У Беларускім дзяржаўным эканамічным унівэрсытэце параўнальна зь мінулым годам кошт вырас на 39%. Навучаньне першакурсьніка будзе каштаваць 11,59 мільёна беларускіх рублёў. Ранейшы кошт — 7 млн 185 тыс. рублёў.

У Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце інфарматыкі і радыёэлектронікі кошты вырасьлі на 40–52%. Прыкладам, навучаньне на факультэце інфармацыйных тэхналёгіяў і кіраваньня будзе каштаваць 14 млн 700 тыс. рублёў.

Інфармацыя пра падвышэньне коштаў навучаньня зьмешчаная на афіцыйных сайтах ВНУ.

БДУ і большасьць іншых вышэйшых вучэльняў Беларусі ўсё яшчэ не абвясьцілі кошты навучаньня для студэнтаў-першакурсьнікаў, адзначае БелаПАН.

Пры гэтым міністар адукацыі Сяргей Маскевіч 26 ліпеня заявіў, што кошты навучаньня студэнтаперш акурсьніка павінны быць абвешчаныя ВНУ ў той жа дзень — 26 ліпеня. Паводле ягоных слоў, у сярэднім навучаньне аднаго студэнта-бюджэтніка ў ВНУ каштуе дзяржаве ад 18 млн рублёў у год.

Заробак 500 доляраў і больш маюць амаль 11% беларусаў

Альбо каля 362 тысяч чалавек.

Гэтыя звесткі на травень 2012 года апублікаваў Нацыянальны статыстычны камітэт.

Амаль палова гэтых людзей працуюць у Мінску, яшчэ 14% — у Гомельскай вобласці, па 8% — у Брэсцкай і Віцебскай абласцях, па 7% — у Магілёўскай і Мінскай абласцях, 5% — у Гродзенскай вобласці.

Паводле статыстычных дадзеных, заробак ніжэйшы за налічаны па краіне (у траўні ён дасягнуў 3,56 млн рублёў) маюць як мінімум 48% працуючых беларусаў, адзначае сайт onliner.by.

ЗАРПЛАТА МОГИЛЕВЧАН РАСТЕТ БЫСТРЕЕ ЦЕН В МАГАЗИНАХ?

Зарплата жителей Могилевской области растет быстрее, чем цены в магазинах. А инфляционные процессы находятся под жестким контролем государства. Такую информацию озвучили во время пресс-конференции в облисполкоме, сообщило радио «Могилёв»

Розничные цены на Могилевщине приближены к среднереспубликанскому уровню, а по многим позициям – ниже, чем в других регионах Беларуси. Например, овощи в Могилеве самые дешевые по сравнению с другими областными центрами.

В целом же за 6 месяцев этого года цены на потребительские товары в регионе выросли на 10 с половиной процентов. При этом рост реальной зарплаты жителей области составил свыше 18 процентов, сообщил первый заместитель управления антимонопольной и ценовой политики Могилевского облисполкома Александр Алексеенко.

Чтоже, остаётся только порадоваться “бешеному” росту наших зарплат и стабильным и низким ценам в родной Могилёвской области. Правда, в магазин я хожу практически каждый день и почему-то слёзы радости от этих самых стабильных наших цен на глаза не наворачиваются. Скорее, плакать хочется от того, что, несмотря на все красивые байки наших чиновников, растут они постоянно. Как не зайдёш в магазин, смотриш, уже что-нибудь подорожало. Про зарплаты вообще молчу, видимо, наши чиновники перепутали простых людей с собой, любимыми. Ведь это нашим труженникам на ниве руководства и представителям бюджетных организаций зарплату за последнее время два раза повышали. Тем же, кто работает на производстве, Александр Григорьевич сказал самим зарабатывать. Сейчас вот с ужасом думаю о том, как ребёнка в школу собирать и покупать всё необходимое. Видимо, уважаемый Александр Алексеенко не смотрел, сколько стоят сейчас самые элементарные детские вещи. А покупать их всё равно придётся, это на себе можно сэкономить, но не на ребёнке.


volgafoto.ru

А что будет со всей этой свистопляской с ростом зарплат после “выборов” в так называемый парламент, вообще думать не хочется. Тем, кто страдает склерозом, рекомендую вспомнить последствия смелых экспериментов наших самых честных в мире чиновников в 2008 и 2010 году. Почему-то кажется, что правды горазда больше говорят как раз враги народа из “пятой колонны”, которые постоянно предупреждают о том, чем может кончится накачка экономики пустыми деньгами.

В одном не сомневаюсь, - чиновники наши на самом деле жить стали лучше, жить стали веселее. Кто мне не верит, пускай посмотрит, какие автомобили приобрели за последнее время многиеруководители из нашего региона. Ну а какие скромненькие домики достраивают некоторые из них, об этом я просто молчу. И детки некоторых, едва окончив школы, уже имеют весьма неплохие собственные квартиры…

Ну а мы будем слушать сказки о счастливой жизни и радоваться копеечному повышению зарплат. Зачем нам думать, правда?

Ирина Беганкина

ПАМЯТНЫЙ ЗНАК В ЧЕСТЬ СЕМЕНА ХАЛИПСКОГО

В Шклове на доме, где родился заслуженный тренер СССР и БССР, кавалер ордена «Дружбы народов» Семен Халипский, установлена памятная табличка в его честь. Семен Львович в разные годы тренировал различные баскетбольные клубы в нашей республике, возглавлял молодежную сборную СССР, национальную сборную Беларуси. Многие его воспитанницы становились победителями европейских и мировых первенств, олимпийскими чемпионками. В 2003 году Халипский назван лучшим тренером за восьмидесятилетнюю историю белорусского баскетбола.

ДОРОГА В НИКУДА

Говорят, что в истории всё повторяется. Сначала это происходит в виде трагедии, потом в виде фарса. Для примера хочу привести некоторые события, произошедшие в Шкловском районе в последние годы Советской власти.

Перестройка открыла двери для пронырливых дельцов, которые стремились найти пути к обогащению разными путями. В основном за счет предприятий. В 1988 году начальником Могилевского отделения белорусской дороги стал Степан Шкапич. Человек весьма предприимчивый, он сразу решил вступить в КПСС. Так как для продолжения карьеры в должности начальника дороги требовалось утверждение ЦК КПБ, ему обязательно надо было стать коммунистом. Следующим шагом стала попытка приватизации Лотвянского деревообрабатывающего завода. Планы были грандиозные. Строительство жилья требовало много изделий из дерева и, полагаясь на связи в Министерстве путей сообщения, была возможность завозить лес из Сибири по бросовым ценам. Масштабы обработки планировались большие, а завод был рассчитан на подвоз только местного леса.



Поэтому возникла идея строительства подъездного пути. По всем правилам надо было рассмотреть несколько проектов укладки пути и выбрать самый оптимальный. Но для деятельного С.Шкапича это было обременительно.

И он пошел по пути указаний. Основной принцип рассуждений был такой. Раз я начальник, то делаю что хочу. Тем более что финансировало это предприятие Министерство путей сообщения. В результате проект обошелся в «копеечку». Стоимость проекта была около двух миллионов рублей. Рубль тогда официально примерно был равен доллару. Но и в технологическом плане это был идиотский проект. Примыкание было осуществлено к главному пути, что было запрещено ПТЭ (правила технической безопасности). Кроме того на станции отсутствовали маневровые светофоры. Для подачи вагонов на подъездной путь надо было передавать управление на так называемое местное управление. Для этого дежурному по станции надо было пройти около километра, получить разрешение от поездного диспетчера и управлять передвижениями дедовским способом с помощью сигнальных флажков. Вероятность брака в работе из-за отсутствия контроля занятости стрелок на маневровой колонке, такого как взрез стрелки, в проведении таких маневров возрастала многократно. Строительство было осуществлено строителями СМП-761. Учитывая большие размеры движения, получить разрешение остановить поездную работу на час для подачи вагонов не мог даже сам С. Шкапич. На станции Лотва постоянно на скрещении стояло один – два грузовых поезда. Ни один ревизор по безопасности движения ни в отделении, ни в управлении Белорусской железной дороги не стал бы против этого нарушения всех устоев безопасности. Играла свою роль поддержка тогдашнего первого заместителя начальника дороги Л. Щенникова. Так создавалась реальная угроза безопасности движения. Но, поруководив Могилевским отделением чуть больше года, С. Шкапич был переведен на вновь открывшуюся для него должность заместителя дороги по экономике. Видимо, разбазаривание средств - основной показатель настоящего экономиста.

(Окончание на стр. 2)

ДОРОГА В НИКУДА

(Оконч. Начало на стр. 6)

В скорости он заменил Л. Щенникова на посту первого заместителя начальника дороги, а чуть позже сменил уже и начальника дороги А. Андреева. Идея резкого увеличения строительства на Могилевском отделении стала для С. Шкапича не актуальна. Завод остался за прежним хозяином, которому подъездной путь был как кость в горле. Так на него не было подано ни одного вагона. В связи с односторонним боковым износом стрелочного перевода, лежащего на главном пути и создававшего реальную угрозу безопасности, он был снят. В последствии были сняты и рельсы. Только больше тысячи деревянных шпал остались гнить до настоящего времени. Так подъездной путь стал дорогой в никуда. Но это не единственный памятник идиотизму в годы развала СССР. На станции Рыжковичи еще видны остатки подъездного пути к базе аммиачных удобрений. Этот вид удобрения стал запрещенным и подъездной путь, не обкатанный ни одним вагоном, был также успешно закрыт. А цена проекта, по грубой оценке, была гораздо больше проекта в Лотве.

И в настоящее время продолжается нерентабельное вложение средств. Яркие примеры - создание комплекса в Александрии, создание Президентского особняка во второй Александрии, реконструкция деревень Александрия и Химы, строительство искусственного озера в Химах. Да и строительство бумажной фабрики не дает больших дивидендов при огромной себестоимости продукции. Строительство дороги в никуда продолжается.

С приходом к власти А. Лукашенко С. Шкапич был тихо (не в пример В. Рахманько) снят с должности начальника дороги. Хотя причин для привлечения к ответственности было не меньше. Затем Шкапич перебрался в Россию. Видимо, от его услуг и там отказались. Сейчас Степан Шкапич возглавляет Брестский электротехнический завод.

Леонид Осипов, «Шклов-инфо»

СТРОЙКОМПЛЕКС МОГИЛЕВЩИНЫ ПОТЕРЯЛ БОЛЕЕ 7 ТЫСЯЧ СПЕЦИАЛИСТОВ

Задание по вводу жилья в первом полугодии Могилевщина выполнила — сдано 190 тысяч квадратных метров. Об этом сообщил на пресс-конференции заместитель председателя комитета по архитектуре и строительству облисполкома Игорь Можаровский. Одной из проблем строительного комплекса сегодня он назвал массовый отток кадров. За последний год из строительных организаций области уволилось более 7 тысяч квалифицированных специалистов. Настоящих мастеров-строителей не хватает. «Наша задача — их вернуть. А вернуть их можно только зарплатой», — подчеркнул Игорь Можаровский. Ориентир — 700-800 долларов. Столько, по его словам, в среднем в месяц зарабатывают наши строители в России.

Юрась ПИВУНОВ, "ВМ"

КРУГЛЯНСКІ РАЙВЫКАНКАМ ПРАЛІЧЫЎСЯ

Згодна рашэння Круглянскага райвыканкам было забаронена пікетаванне з мэтай збору подпісаў у падтрымку кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў практычна ва ўсіх людных месцах гарадскога пасёлка. Кантроль за выкананнем гэтага рашэння райвыканкама быў ускладзены на намесніка старшыні райвыканкама Тамару Аксёнаву, якая ўжо на працягу шэрагу гадоў адказвае за правядзенне выбарчых кампаній у Круглянскім раёне.

Як падкрэсліла жыхарка г.п. Круглае Зінаіда Мілешчанка, якая з'яўляецца патэнцыйнай кандыдаткай ад партыі "Справядлівы свет" па Шклоўскай выбарчай акрузе № 90, райвыканкам забараніў збор подпісаў практычна ва ўсіх людных месцах: "Фактычна ў раёне подпісы за вылучэнне кандыдатаў, згодна рашэння, можна збіраць толькі там, дзе няма людзей, якія гэтыя подпісы павінны ставіць. Навошта ўладам прымаць такое дзіўнае рашэнне, калі яны збіраюцца праводзіць чэсныя і справядлівыя выбары, мне абсалютна незразумела".

Між тым Круглянскія чыноўнікі пралічыліся, прыняўшы такое недэмакратычнае рашэнне. Аказалася, што збіраць подпісы ў Шклоўскай выбарчай акрузе № 90 будуць толькі за праўладнага кандыдата, намесніка старшыні КДК і пенсіянера па ўзросту Аляксандра Агеева. Іншыя прэтэндэнты ў кандыдаты ад дэмакратычных партый будуць вылучацца шляхам партыйнага вылучэння на з'ездах арганізацый.



Атрымалася, што Круглянскі райвыканкам сам сабе нашкодзіў, бо зараз, згодна яго ж рашэння, няма магчымасці выставіць пікеты ў людных месцах прэтэндэнту ў кандыдаты, якому так імкнуліся дагадзіць круглянскія чыноўнікі. Зараз круглянскія ідэолагі думаюць. Як выйсці з пікантнай сітуацыі…

Віктар Баравікоў

СТАНИСЛАВ БОГДАНКЕВИЧ: В СЕНТЯБРЕ-ОКТЯБРЕ ОБВАЛЬНОЙ ДЕВАЛЬВАЦИИ НЕ БУДЕТ



Станислав Богданкевич

Вероятнее всего, не будет ее и до конца года. Однако ползучая девальвация в Беларуси продолжится, что выразится в дальнейшем росте цен на товары повседневного спроса.

Таким мнением с «Ежедневником» поделился бывший глава Нацбанка Беларуси Станислав Богданкевич. Он также ответил на вопросы, связанные с появлением в белорусских СМИ информации о закрытом совещании Национального банка, в ходе которого обсуждалась возможность проведения новой девальвации в стране.

- Станислав Антонович, как вы относитесь к возможности обсуждения новой девальвации и насколько вероятно ее проведение в ближайшее время?

- То, что в Нацбанке могут обсуждать любые варианты – это вполне реально. Но если кто-то будет говорить, что можно ожидать девальвации до парламентских выборов – это «липа». Никаких оснований сегодня для обвальной девальвации нет. Ползучая девальвация действительно есть. Растут цены на хлеб, на сахар, на мясо. Будет расти цена и доллара. Но она будет расти в разумных рамках.

- Как говорилось в СМИ, «один из вероятных сценариев подразумевает доведение курса рубля до 15 тысяч рублей за доллар. Оптимальная ставка определена в районе 12 тысяч за доллар». Насколько эти цифры реальны?

- Наверное, если брать срок 5 лет, то вполне реальны. Если брать полгода, то абсолютная болтовня. Нужно рассматривать фундаментальные вопросы. Фундамент – это внешняя торговля. Она в первом полугодье у Беларуси положительная и внезапно отрицательной она не станет. Ведь будут продолжаться поставки нефти и газа на льготных условиях.

То есть валютный курс резко падать не будет. Кроме того, рублевая масса – повышения зарплат, пенсий, - поглощается ростом потребительских цен. Будут расти цены на жилищно-коммунальные услуги, бензин, керосин и другие товары. И это все будет поглощаться. В результате зарплата может быть и 500 долларов, а люди будут беднее жить, чем получая сегодня 370 долларов в эквиваленте. Эти перекосы связаны с плановой экономикой.

- А в целом как вы относитесь к перспективам девальвации?

- В сентябре-октябре месяце обвальной девальвации не будет. Может быть, дойдет до 9 тысяч белорусских рублей за доллар. Я бы предположил, что к концу года курс может быть и 10 тысяч рублей за доллар. Но это не обвальная девальвация.

- Обвальной девальвации не будет потому, что белорусская экономика сейчас, как утверждается, на подъеме?

- Рост валового производства составил за полугодье 2,9%. Разве это подъем? У нас было и 10%. Реальная зарплата выросла на 3%. А то, что долларовый эквивалент увеличивается – это связано со стабильностью валютного курса. Данный же курс связан с масштабной выработкой Беларусью беспошлинного растворителя-разбавителя из российской нефти, который мы произвели и продали Западу.

Как посмотрит на это Россия – другой вопрос. Если потребует заплатить полученные таким путем 2 млрд. долларов – тогда мы будем испытывать трудности. Но, думаю, Владимиру Путину выгоднее втянуть в Российскую империю Беларусь, чем получить назад эти деньги. Соответственно российские власти будут лавировать. То есть очень много политических составляющих, влияющих на экономику. Но, полагаю, белорусская внешняя торговля в ближайшее время будет сбалансированной, что обусловлено реэкспортом нефтепродуктов.

Ежедневник

Шкловский проходимец

Возбуждено уголовное дело в отношении директора одного из частных предприятий Шклова. Придуманный им алгоритм действий был таков: удобрения поступали с предприятий агросервиса других регионов страны, их расфасовывали в пакеты и мешки по тонне и отправляли на продажу в Россию. Но по документам их отгрузка проводилась в адрес некических белорусских фирм (на самом деле — лжепредпринимательских структур). Таким образом, мимо бюджета страны прошли налоги в сумме 420 миллионов рублей.

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах,
распаўсюджваецца бясплатна

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: Магілёўская воб, Бялыніцкі р-н, аг-к Вялікая Машчаніца. Тэл. 8 (02232) 37-110. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Барысаў Іван Віктаравіч. Падпісана ў друк 02.08.2012 г. у 15 -00